3. Молодяков, В.Э. «Образ Японии» в Европе и России второй половины XIX–начала XX в. М. : Институт востоковедения РАН, 1996. – 184 с.

4. Най, Дж.С. Гибкая власть: Как добиться успеха в мировой политике. – Новосибирск – Москва, 2006. – 216 с.

5. Эпова, М.А. Культурная дипломатия Японии // Гуманитарные научные исследования. – 2014. – № 2 [Электронный ресурс]. URL: Режим доступа : http://human.snauka.ru/2014/02/5861. – Дата доступа : 26.02.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Каравай Г.А.,** студ. 212 гр.
**Марозава Н.С.,** студ. ДТТ2 гр. БДЭУ
Навуковы кіраўнікт – Байко А.П.

## ГАТОЎНАСЦЬ БУДУЧЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ СКД ДА АРГАНІЗАЦЫІ ВАЛАНЦЁРСКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА

У тлумачальным слоўніку Ожагава «гатоўнасць» мае два значэння: першае – «згода зрабіць што-небудзь»; другое – «стан, пры якім усё зроблена, усё гатова для чаго-небудзь». Прыкладам могуць быць словазлучэння «баявая гатоўнасць» (здольнасць войскаў пачаць і весці баявыя дзеянні), «гатоўнасць нумар адзін» (поўная баявая гатоўнасць, а таксама наогул гатоўнасць да выканання якога-небудзь дзеяння, заданні) [4].

У тлумачэннях слова «гатоўнасць» па Яфрэмавай мы знаходзім найбольш блізкі да тэмы даследавання варыянт азначэння, а менавіта: гатоўнасць – гэта псіхалагічная настроенасць на што-небудзь [3], адпаведна «гатоўнасць да арганізацыі валанцёрскай дзейнасці» – у першую

чаргу гатоўнасць маральная і псіхалагічная выступіць для мясцовага насельніцтва арганізатарам валанцёрскай працы.

Нагадаем, што валанцёрская праца – гэта любы від бязвыплатнай дзейнасці, накіраванай на карысць людзей, якія не з'яўляюцца блізкімі сваякамі валанцёра, а таксама дзейнасці, накіраванай на ахову навакольнага асяроддзя альбо вырашэння актуальных праблем розных сфер жыццядзейнасці грамадства.

У межах працэсу прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў сферы дзейнасці «чалавек-чалавек» важнае месца адводзіцца практыцы і грамадскай дзейнасці для набыцця эмпірычнага вопыту, самастойнага прымянення назапашаных тэарэтычных ведаў. Ва ўмовах абмежаванасці практычнага навучання не абысціся без дапамогі грамадскіх арганізацый.

Шмат гадоў паспяхова працуюць з добраахвотнікамі і валанцёрамі з ліку студэнтаў у нашых універсітэтах такія арганізацыі як: ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа, Прафсаюзная арганізацыя студэнтаў, у БДУКМ ёсць валанцёрскі клуб «СЛОН». У сваёй працы гэтыя арганізацыі абапіраюцца на асабістыя якасці валанцёраў (спачуванне да людзей, падатлівасць, практычная кемлівасць, уменне працаваць у камандзе, паслядоўнасць і надзейнасць) і сфармаваную актыўна-дзейсную пазіцыю.

Як адзначаюць даследчыкі да фарміравання гатоўнасці да арганізацыі валанцёрскай дзейнасці, як і да падрыхтоўкі саміх валанцёраў, варта падыходзіць комплексна, не толькі паклапаціцца пра багаж ведаў і навыкаў, а і пра забеспячэнне працэсу самаадукацыі. Што ж уяўляе сабой неабходны для валанцёра мінімум ведаў? У першую чаргу, валанцёр любога ўзросту павінен быць азнаёмлены з Усеагульнай Дэкларацыяй Валанцёраў [5] і інструкцыяй па тэхніцы бяспекі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прынцып актыўнага навучання «learning by doing», які́м выкарыстоўваюць у валанцёрскім клубе «СЛОН» пры падрыхтоўцы студэнтаў-валанцёраў, прадугледжвае не проста набыццё ведаў, але і навыкаў. Неабходныя для валанцёраў навыкі – гэта, у першую чаргу, навыкі камунікатыўныя для працы ў камандзе, навыкі зносін з людзьмі ў складаных жыццёвых сітуацыях (адзінокія старыя, дзеці-інваліды). Дарэчы на базе валанцёрскага клуба "СЛОН" у 2010-2013 гг. была распрацавана і ўкаранена методыка фарміравання гатоўнасці будучых спецыялістаў СКД да арганізацыі валанцёрскай дзейнасці (аўтар магістр педагагічных навук А.У. Кузьміч), якая ўключае тры этапы [2].

На першым этапе, які называецца «Фарміраванне гатоўнасці будучых спецыялістаў СКД да валанцёрскай дзейнасці», і рэалізуецца на першым курсе навучання, гатоўнасць фарміруецца праз удзел у валанцёрскіх мерапрыемствах; на другім – «Школа арганізатара валанцёрскай дзейнасці» (рэалізуецца на другім курсе навучання), будучых спецыялістаў СКД навучаюць навыкам арганізацыі валанцёрскай дзейнасці праз арганізацыю валанцёрскіх мерапрыемстваў; на апошнім этапе «Роўны навучае роўнага: фарміраванне гатоўнасці да валанцёрскай дзейнасці» (на 3-4 курсах) валанцёры-арганізатары, якія прайшлі папярэднія этапы прыцягваюцца да падрыхтоўкі новых валанцёраў з ліку студэнтаў 1 і 2 курсаў і арганізацыі ўласных валанцёрскіх мерапрыемстваў і акцый.

Згодна з вышэйназванай методыкай, перш чым стаць арганізатарам сярод рознаўзроставага насельніцтва будучым спецыялістам СКД прапануецца стаць лідарам сярод аднагодкаў. Праграма падрыхтоўкі валанцёраў уключае: творчыя заданні; групавая праца і гульні (імітацыі, ролевыя, дзелавыя і адукацыйныя гульні); тэхналогія «роўны навучае роўнага»; відэа-трэнінг, абмеркаванне складаных і дыскусійных тым,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праектыўныя тэхнікі (я да ..., я пасля ...), методыкі вырашэння праблем («дрэва рашэнняў», «мазгавы штурм»).

У клубе ўжываюць тры асноўных формы прыёму валанцёраў:

- набор (запрашаюцца ўсе жадаючыя, якія на іх думку змогуць выканаць абумоўленую (пэўную) дзейнасць);
- падбор (ажыццяўляецца шляхам выбару з пэўнай мэтавай групы тых, хто ў большай ступені адпавядае патрабаванням для спецыфічнай дзейнасці);
- адбор (як частка набору, калі адбіраюцца кандыдатуры з ліку ўжо запрошаных, па пэўных суб'ектыўных крытэрыях, напрыклад, псіхалагічная сумяшчальнасць будучых членаў адной каманды або выкананне роляў у дабрачынным спектаклі).

Да таго як пераходзіць да актыўнай дзейнасці валанцёры вучацца выяўляць матывы і ўлічваць фактары, якія ўплываюць на пошук добраахвотнікаў сярод насельніцтва. Так сярод сацыяльных груп выдзяляюцца найбольш эмпатычныя да дабрачыннай дзейнасці і валанцёрства: «маладыя» старыя (пенсіянеры, якія вымушаны сысці з працы, але жадаючыя быць карыснымі); людзі з інваліднасцю, якія не маюць працы ў дадзены момант; студэнты, якія жадаюць папрактыкавацца; людзі пасля турмы, або беспрацоўныя, якія жадаюць вярнуцца да нармальнага жыцця; прадстаўнікі прыватнага сектара, якія імкнуцца дапамагчы людзям у небяспечным стане.

Асноўнымі матывамі ўдзелу дарослага насельніцтва ў валанцёрскай дзейнасці з’яўляюцца: альтруізм (жаданне «бескарысліва рабіць дабро»); каб кампенсаваць адсутнасць чаго-небудзь у асабістым жыцці валанцёра; каб набыць і асэнсаваць уласны вопыт; каб знайсці сэнс ў жыцці і ролю ў грамадстве і інш [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Уменні арганізоўваць інфармацыйныя кампаніі фарміруецца пад час самастойнага пошуку валанцёраў для акцый праз сяброў і знаёмых; праз рэкламу і наглядную агітацыю, гутаркі, артыкулы ў СМІ і праз інтэрнэт. На інтэрнэт-рэсурсах валанцёры шукаюць аднадумцаў, дзеляцца вопытам, атрымліваюць рознага роду падтрымку. Эфектыўным спосабам прыцягнення патэнцыйных добраахвотнікаў з'яўляецца стварэнне валанцёрамі спецыялізаваных груп у сацыяльных сетках з пералікам традыцыйных мерапрыемстваў і вакансій па іх.

Арганізацыйныя і лідарскія кампетэнцыі развіваюцца пад час акцый, на якіх валанцёры выразна тлумачаць добраахвотнікам, у чым складаецца іх роля і наколькі яна важная; даюць чалавеку адчуць, што ад яго працы непасрэдна залежыць поспех агульнай справы; выслухваючы заўвагі і каментарыі і прымаючы патрэбныя меры; правільна ацэньваючы, калі іх падначаленаму неабходна змена дзейнасці (імкнучыся зрабіць іх працу прыемнай, пасільнай і адпаведнай іх чаканням); прадумваючы «узнагароды» іх за працу.

Вырашаюць арганізатары-валанцёры пытанні задавальнення натуральных патрэб удзельнікаў і іх выдаткаў звязаных з удзелам у валанцёрскай рабоце (харчаванне, праезд, пражыванне), вучацца прэтэндаваць на арганізацыйную, метадычную і фінансавую падтрымку з боку грамадскіх арганізацый, органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, бізнес-структур.

Вельмі важна, каб у святле рашэння задач па фарміраванні гатоўнасці да арганізацыі валанцёрскай дзейнасці будучых спецыялістаў падавалася магчымым рэалізацыя ўласных валанцёрскіх праектаў, якія адпавядалі б спецыялізацыі маладога спецыяліста. Напрыклад, будучы арганізатар турыстычнай дзейнасці працаваў бы над праектам «Суседскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маршруты» для асоб сталага ўзросту, а будучы спецыяліст па СКД на праектам «Клуб ўзаемадапамозе ў доме культуры» і г.д.

Такім чынам, патрабаваннямі часу становяцца: стварэнне спрыяльных умоў для ўсвядомленага выбару студэнтамі валанцёрскай працы, своечасовае фарміраванне гатоўнасці да арганізацыі валанцёрскай дзейнасці сярод насельніцтва, што можа і павінна паслужыць добрым падмуркам для будаўніцтва прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыяльна-культурнай сферы.

Этап студэнцтва, трэба разглядаць як сензітыўны перыяд у жыцці валанцёра, які ставарае найбольш спрыяльныя ўмовы для фарміравання гатоўнасці, пэўных псіхалагічных уласцівасцей і відаў паводзін, неабходных для арганізатара валанцёрскай дзейнасці іншых людзей.

---

1. Добровольцы: как их найти, как их удержать. – СПб. : Юнайтед Уэй Интернэшнл. – 125 с.

2. Кузьміч, А.У. Фарміраванне гатоўнасці будучых спецыялістаў СКД да валанцёрскай дзейнасці / А.У. Кузьміч //. Культурная спадчына беларускага народа: праблемы захавання і развіцця [Электронны рэсурс] (даклады, прачытаныя на XXXVI выніковай навуковай канферэнцыі студэнтаў і магістрантаў БДУ культуры і мастацтваў 28-29 красавіка 2011 г.) / Рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.); Смолік А.І., Пракапцова В.П., Казлоўская Л.І., Зыгмантовіч С.В. ; УА «Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў”. – Мінск, 2011. – 1160 с. – Бел. – Дэп. у ДУ ”БелІСА” 15.03.2012 г., № Д20121. – С. 689–691.

3. Новый толково-словообразовательный словарь русского языка / ред. Т.Ф. Ефремовой. – М. : Русский язык, 2000. – 1024 с.

4. Ожегов, С.И. Толковый словарь русского языка / С.И. Ожегов, Н.Ю. Шведова. – М. : Изд-во «Азъ», 1992. – 736 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. International Association for Volunteer Effort (Международная ассоциация по консолидации усилий добровольцев) [Электронный ресурс] – © 2015. – Режим доступа : http://www.iave.org. – Дата доступа : 09.02.2016.

**Каракулько А.Н.,** студ. 408 гр.
Научный руководитель – Зезюля А.Г.

## ИНФРАСТРУКТУРА ОТРАСЛИ КУЛЬТУРЫ И ИСКУССТВ СЛУЦКОГО РЕГИОНА

Культура Слутчины зародилась ещё в далёком прошлом. Она являлась потребностью людей в творчестве и выражалась в создании одежды, домашней утвари, а также в песнях и сказках.

В Слуцком Троицком монастыре уже в XV в. вели летописи, переписывали книги, а также действовала библиотека. В XVI в. начала свою работу иконописная мастерская. В XVII в. создана типография. Слуцк также был одним из центров театрального искусства. Был открыт театр, балетная школа, народный театр батлейка. В советские годы, на Слутчине активно началась массовая культурно-просветительская работа: в сёлах были открыты избы-читальни, в городе – организация «Папарацькветка». Издавалась районная газета.

В 1930 гг. в Слуцке работал Городской дом культуры, 3 клуба, кинотеатр и 7 библиотек. В 1965 г. был открыт краеведческий музей. Сейчас в Слуцком районе функционирует 91 учреждение культуры и искусств. При клубах работают 460 коллективов и кружков художественной самодеятельности, в которых занимаются более 7100

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ